# ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА Ў 2024 ГОДЗЕ

***Камендантава В.М.,***
*намеснік дырэктара Віцебскай*
*абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*

Асноўнымі задачамі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна ў 2024 годзе па-ранейшаму заставаліся развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, цікавасці да вывучэння гісторыі і культуры Віцебшчыны, максімальна поўнае забеспячэнне запытаў карыстальнікаў, далучэнне іх да найлепшых узораў беларускай кніжнай спадчыны, творчасці дзеячаў беларускай і замежнай літаратуры, культуры, мастацтва.

Аддзеламі бібліятэкі абслужана 31739 непасрэдных карыстальнікаў пры плане 30000 (105,8 % да плана). З іх агульнай колькасці дзеці ва ўзросце да 18 гадоў склалі 8397. Карыстальнікам за справаздачны год выдана 629960 экз. бібліятэчных дакументаў (98,4 % да запланаванага). Праз сістэму МБА абслугоўвалася 116 абанентаў, якім было выдана 350 экз. дакументаў. Агульная колькасць наведванняў склала 1923953 (102,6 % да плана). У справаздачным годзе колькасць віртуальных наведванняў на афіцыйны сайт бібліятэкі склала 1768895 наведванняў, непасрэдных – 155058. На працягу года ў бібліятэцы і па-за яе сценамі прайшло 631 масавае мерапрыемства, якія наведалі 17368 чалавек.

У выніку змены структуры бібліятэкі з 1 верасня нямецкая чытальная зала ўвайшла ў склад аддзела выданняў на замежных мовах, аддзел рэдкай кнігі быў пераўтвораны ў сектар, адбылося расфарміраванне сектара алічбоўкі дакументаў, што ажыццяўляў дзейнасць у складзе аддзела захоўвання асноўнага фонду і алічбоўкі дакументаў. Надалей дадзены від дзейнасці ўскладзены на спецыялістаў аддзела аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў. Такім чынам, на канец справаздачнага года ў бібліятэцы працавала 4 функцыянальныя аддзелы і 14 аддзелаў і сектараў абслугоўвання, якія былі адкрытыя для карыстальнікаў 299 дзён.

У 2024 годзе ў бібліятэцы працаваў 81 бібліятэчны работнік. З 45 супрацоўнікаў аддзелаў абслугоўвання 39 бібліятэчных кіраўнікоў і спецыялістаў былі заняты непасрэдна абслугоўваннем чытачоў.

На камплектаванне бібліятэчнага фонду зрасходавана 306,4 тыс. рублёў бюджэтных сродкаў. У тым ліку: на набыццё бібліятэчных дакументаў (кніг, брашур, нот, выяўленчых і аўдыявізуальных дакументаў) – 153,7 тыс. руб., на перыядычныя выданні – 119,3 тыс. руб., на набыццё электронных інфармацыйных рэсурсаў і праў доступу да іх – 33,4 тыс. руб. Усяго ў фонд бібліятэкі паступіла 9953 экз. дакументаў, з іх 1127 экз. – сацыяльна значныя выданні. За бюджэтныя сродкі набыта 8838 экз. Паказчык ад агульнага бюджэту на камплектаванне склаў 13,3 % (у 2023 годзе – 12,7 %). На пачатак 2025 года бібліятэчны фонд склаў 662533 адзінак захоўвання.

У адпаведнасці з Дагаворам на аказанне паслуг Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з кастрычніка справаздачнага года для карыстальнікаў Віцебскай абласной бібліятэкі прадастаўлены лакальны доступ да аўтаматызаванай сістэмы «Электронная бібліятэка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», якая функцыянуе як сховішча лічбавых копій кніжных выданняў і разнастайных выяўленчых матэрыялаў з фондаў галоўнай бібліятэкі краіны. Рэсурс змяшчае больш за 130 тыс. дакументаў, і колькасць іх пастаянна павялічваецца.

Для максімальна поўнага задавальнення інфармацыйных запытаў карыстальнікаў бібліятэкі былі набыты правы доступу да ліцэнзійных электронна-бібліятэчных сістэм «Znanium.com», «Университетская библиотека онлайн», электроннай бібліятэкі «ЛитРес».

У справаздачным годзе была працягнута генерацыя ўласных інфармацыйных рэсурсаў: электронны каталог павялічыўся на 41853 запісы. За гэты перыяд прайшоў алічбаванне 71 дакумент агульнай колькасцю

23895 старонак, аб'ём алічбаванай за 2022–2024 гады інфармацыі склаў 627,1 Гб. З мэтай павышэння эфектыўнасці выкарыстання алічбаваных выданняў супрацоўнікамі бібліятэкі створаны новы электронны рэсурс – «Рэгіянальны архіў перыядычных выданняў». У ім у фармаце PDF прадстаўлены электронныя версіі газет, якія выходзілі на тэрыторыі Віцебскай вобласці з 1946 года.

2024 год быў вызначаны стварэннем новага мультымедыйнага праекта «Ваенныя дарогі бібліятэкараў Віцебшчыны», прымеркаванага да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 95-годдзя з дня заснавання абласной бібліятэкі. Яго асноўная мэта – захаваць памяць аб бібліятэкарах – удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, якія працавалі ў бібліятэках г. Віцебска і Віцебскай вобласці. Прэзентацыя рэсурсу для шырокай грамадскасці прайшла 4 верасня, а ў снежні ён быў прадстаўлены на штогадовы рэспубліканскі конкурс Міністэрства культуры на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі.

На працягу мінулага года супрацоўнікі бібліятэкі забяспечвалі аператыўнае даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў у зале каталогаў і аддзелах абслугоўвання бібліятэкі. Па запытах непасрэдных карыстальнікаў было выканана 11044 бібліяграфічныя і фактаграфічныя даведкі. Для пошуку нацыянальных заканадаўчых дакументаў, а таксама заканадаўчых актаў Расійскай Федэрацыі ў аддзеле прававой інфармацыі і электронных рэсурсаў шырока выкарыстоўвалася электронная інфармацыйна-пошукавая сістэма (ІПС) «Эталон» версіі 6.9. За 2024 год да яе звярнуліся 1938 карыстальнікаў бібліятэкі. У мэтах павышэння інфармацыйнай культуры карыстальнікаў у 2024 годзе былі праведзены 32 экскурсіі па бібліятэцы, акрамя іх 61 экскурсія прайшла па сектары рэдкай кнігі і выставачнай зале «ExLibris». Агульная колькасць традыцыйных бібліятэчных выстаў склала 462, з якіх 81 была адрасавана чытачам-дзецям. Акрамя іх супрацоўнікамі бібліятэкі былі распрацаваны 30 анлайн-выстаў, электронных прэзентацый і віртуальных аглядаў.

Найбольш значныя сацыякультурныя мерапрыемствы мелі патрыятычную накіраванасць, а галоўнымі тэмамі Года якасці сталі стваральная праца, дасягненне дабрабыту, выніковасць ва ўсіх сферах дзейнасці і аптымізацыя вытворчасці краіны. Асноўнымі мерапрыемствамі бібліятэкі па вызначаных тэмах сталі праекты «Лабараторыя поспеху: ад ідэі да бізнесу» і «Дасведчаны спажывец: выбіраем якасць». Першы з іх уяўляў сабой цыкл сустрэч для старшакласнікаў сярэдніх школ г. Віцебска з паспяховымі прадпрымальнікамі, бізнесменамі і кіраўнікамі розных прадпрыемстваў і арганізацый горада. Старт праекту быў дадзены 19 сакавіка, і распачаўся ён з сустрэчы ў фармаце адкрытага дыялогу з прадстаўнікамі ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблгаз». Надалей на працягу года прайшлі сустрэчы з кіраўнікамі і спецыялістамі ААТ «Віцебскія дываны», Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага страхавога прадпрыемства «Белдзяржстрах», тэлерадыёкампаніі «Віцебск», Віцебскай абласной бібліятэкі, Віцебскага жаночага духоўнага вучылішча, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, СТАА «Белвест». На працягу года было арганізавана 8 сустрэч, якія ахапілі розныя галіны і сферы дзейнасці, адкрываючы для школьнікаў разнастайныя перспектывы прафесійнага развіцця.

Праект «Дасведчаны спажывец: выбіраем якасць» стартаваў 28 сакавіка, і першым яго ўдзельнікам стала найбуйнейшая ў Віцебскай вобласці арганізацыя па аказанні бытавых паслуг ААТ «Свет паслуг Плюс». На працягу года на сустрэчы з карыстальнікамі бібліятэкі запрашаліся прадстаўнікі Віцебскага абласнога дыспансера спартыўнай медыцыны і Віцебскага філіяла «БелЭкспа».

Да Года якасці былі складзены анатаваныя бібліяграфічныя спісы літаратуры «Импортозамещение в Беларуси: миф или реальность?» і «Под знаком качества», даступныя для прагляду і скачвання з афіцыйнага сайта бібліятэкі.

Сярод бібліятэчных мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці асаблівай увагі заслугоўвае тэматычны вечар «Тры штыкі вартуюць цішыню», прысвечаны значным падзеям у жыцці горада: 1050-годдзю з дня заснавання і 80-годдзю вызвалення, што адбыўся 26 чэрвеня. Цэнтральнай падзеяй мерапрыемства стала прэзентацыя трэцяга выдання кнігі «Витебское подполье» Ніны і Мікалая Дарафеенкаў, Мікалая Пахомава.

На працягу справаздачнага года мэтанакіравана праводзілася работа па далучэнні карыстальнікаў да вывучэння нацыянальнай культуры, мовы і літаратуры. Добрай традыцыяй бібліятэкі стала святкаванне Міжнароднага дня роднай мовы. У мінулым годзе яно выйшла на абласны ўзровень: з 19 па 25 лютага Віцебская абласная бібліятэка сумесна з публічнымі бібліятэкамі Віцебшчыны правяла рэгіянальны марафон «Размаўляй і натхняй». На працягу тыдня ў бібліятэках ладзіліся разнастайныя мерапрыемствы, прысвечаныя беларускай мове: акцыі, конкурсы, віктарыны, прэзентацыі кніг, сустрэчы з аўтарамі, літаратурна-музычныя вечарыны. Праграма марафона ўключыла агульнай колькасцю каля 240 мерапрыемстваў, самым значным з якіх стала акцыя #Віцебскіслоўнік!, што праходзіла на спецыяльна створанай старонцы ў Instagram @vitsebski_slounik. Па ўмовах акцыі ад кожнай раённай бібліятэкі было даслана адно або некалькі слоў, тэматычна праілюстраваных і аформленых у выглядзе малюнка. Выбраныя словы, акрамя таго што адлюстроўваюць багацце і напеўнасць беларускай мовы, маюць асацыятыўную сувязь з канкрэтнай мясцовасцю, з’яўляюцца словамі-брэндамі, што яе характарызуюць.

Відавочна, што асаблівая ўвага ў мінулым годзе надавалася папулярызацыі творчасці віцебскіх аўтараў. Знакавай падзеяй стаў выхад у свет зборніка «Зямлі нязгаснае святло», у які ўвайшлі вершы паэтаў – ураджэнцаў Віцебшчыны Янкі Сіпакова, Алега Салтука, Анатоля Канапелькі. Падрыхтаваў зборнік Выдавецкі дом «Звязда», а яго прэзентацыя адбылася ў бібліятэцы 8 лютага.

Сярод іншых урачыстасцей у святочную праграму мерапрыемстваў да Дня бібліятэк Беларусі ўвайшоў і юбілейны творчы вечар літаратуразнаўцы, кандыдата філалагічных навук, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтара шэрагу зборнікаў паэзіі Вольгі Русілкі, якая, прынамсі, стала лаўрэатам Літаратурнай прэміі імя Петруся Броўкі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за 2024 год. Акрамя Вольгі Іванаўны высокую ўзнагароду за зборнік вершаў «Санеты» атрымала Галіна Загурская, паэтка і мастак з горада Полацка. Урачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў адзначанай прэміі па традыцыі прайшла напрыканцы года і сабрала ў бібліятэцы гасцей, сярод якіх былі кіраўнікі і спецыялісты Віцебскага аблвыканкама, прадстаўнікі пісьменніцкай супольнасці і супрацоўнікі абласной бібліятэкі.

Акрамя літаратурнага актыўна развіваўся напрамак гістарычнага краязнаўства. Асноўныя мерапрыемствы дадзенай тэматыкі прайшлі ў рамках асветніцкага цыкла «Краязнаўчыя сустрэчы», і першае з іх адбылося 30 мая ў фармаце творчай сустрэчы з Аляксандрам Бараноўскім – першым намеснікам дырэктара па навуцы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдатам гістарычных навук, аўтарам навукова-папулярных выданняў і біяграфічных даведнікаў, прац па гісторыі беларускай дзяржаўнасці, краязнаўстве. У час мерапрыемства прайшла прэзентацыя кнігі «Віцебшчына ў дзяржаўна-тэрытарыяльным уладкаванні Савецкай Беларусі (1919–1924 гг.)» і зборніка «Талачынскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна».

На працягу года ў рамках цыкла прайшлі прэзентацыі кніг віцебскіх аўтараў: «Краязнаўчы атлас Віцебскага раёна» кандыдата гістарычных навук, дацэнта Мікалая Півавара, «Витебск: Спасская улица. Комиссар Путна» доктара мастацтвазнаўства, прафесара Таццяны Катовіч, «Малоизвестные страницы истории Дубровенского края» намесніка старшыні Віцебскага абласнога савета ветэранаў, краязнаўцы Міхаіла Ляшчынскага, «Очерки по истории Витебского края» дацэнта кафедры правазнаўства і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Віцебскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта «МІПСА», кандыдата гістарычных

навук Таццяны Івановай, а таксама юбілейная вечарына краязнаўцы, стваральніка і кіраўніка народнага комплекснага музея «Гісторыя Заронаўскага краю», актывіста пошукавага руху Людмілы Нікіцінай.

Сярод значных асветніцкіх мерапрыемстваў трэба адзначыць краязнаўчы выставачны праект Віцебскай абласной бібліятэкі і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, рэалізаваны сумеснымі намаганнямі: 11 ліпеня ў бібліятэцы адкрылася выстава «Спадчына збіральніка “Віцебскай даўніны”», прысвечаная Аляксею Сапунову – выбітнаму гісторыку, археографу і краязнаўцы.

На працягу года ў бібліятэцы праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю літаратуры па мастацтве, у дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў сферы культуры, мастацкай адукацыі, знаёмства з рознымі відамі мастацтва і творчасцю віцебскіх аўтараў. У рамках праекта «Адлюстраванне» былі арганізаваны і прадстаўлены шырокай аўдыторыі 16 мастацкіх выстаў прафесійных мастакоў і творцаў-аматараў, праведзены 10 выстаў дзіцячай творчасці. У рамках праекта «Бібліятэка – тэрыторыя творчасці» праведзена 42 заняткі па папяровай пластыцы, цестапластыцы, арыгамі і аплікацыі. Прайшлі 52 заняткі школы малявання для дарослых «MASTAK».

Бадай, самай незвычайнай творчай конкурснай падзеяй года стаў праект «Библиотечный КОТ. Книги. Общение. Творчество». Распачаўся ён 29 лютага з адкрыцця ўнікальнай выставы катоў-сувеніраў са ўсяго свету «Коты Путешественника» з прыватнай калекцыі турагента і выкладчыка Дзмітрыя Рыжыка. Адкрыццё выставы стала першай падзеяй праекта, які аб’яднаў цэлы шэраг літаратурных і пазнавальных мерапрыемстваў, конкурсаў, выстаў, майстар-класаў. Найбольшая актыўнасць па наведванні выставы была зафіксавана падчас вясновых канікулаў, а самае відовішчнае мерапрыемства – сямейнае свята «Библиотечный КОТ. Книги. Общение. Творчество» з цырымоніяй узнагароджання пераможцаў конкурсу творчых работ «Кніжны кот Фаліянт», прысвечанага талісману аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі, – прайшло 22 мая. На конкурс было пададзена 288 заявак ад вучняў школ і гімназій, выхаванцаў мастацкіх студый і аб’яднанняў па інтарэсах, якія ўвасобілі сваіх любімцаў у акварэлі і гуашы, алоўкамі і маркерамі, са скуры і футра, з пражы і гліны. Удзельнікі конкурсу стваралі кніжнага ката ў намінацыях «Жывапіс, графіка» і «Дэкаратыўна-прыкладная творчасць», выкарыстоўваючы самыя разнастайныя тэхнікі і не стрымліваючы сваю фантазію.

У мінулым годзе была распачата рэалізацыя адноўленай мэтавай комплекснай праграмы «Жывое слова мудрасці духоўнай», што па ўзгадненні з кіраўніцтвам камісіі па праваслаўных бібліятэках і кафедрах праваслаўнай літаратуры Віцебскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы разлічана на 2024–2026 гады. Асноўныя мерапрыемствы, накіраваныя на духоўную асвету і выхаванне на праваслаўных традыцыях, у справаздачным годзе былі праведзены ў рамках рэалізацыі вышэй адзначанай праграмы і мелі вялікую разнастайнасць формаў і тэм.

Найбольшы рэзананс меў цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня праваслаўнай кнігі, які распачаўся 12 сакавіка творчым вечарам «Шлях святой Еўфрасінні». Цэнтральнай часткай сустрэчы стала прэзентацыя выданняў выдавецтва Спаса-Еўфрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра г. Полацка, якую правялі яго насельніцы. Шэраг прэзентацыйных мерапрыемстваў праваслаўнай літаратуры быў працягнуты 27 сакавіка. У гэты дзень віцебскай аўдыторыі былі прадстаўлены навінкі выдавецтва Свята-Елісавецінскага манастыра, аднаго з вядучых царкоўных выдавецтваў Беларусі.

Наступная прэзентацыя адбылася напярэдадні Дня славянскага пісьменства і культуры і Дня памяці святых роўнаапостальных Кірыла і Мяфодзія. На гэты раз шырокай грамадскасці было прадстаўлена факсімільнае ўзнаўленне Жухавіцкага Евангелля, ініцыятарам выпуску якога выступіў Замкавы комплекс «Мір». Асноўным спікерам мерапрыемства стаў вучоны сакратар адзначанай установы Ігар Ложачнік, які падзяліўся дэталямі працы па ўзнаўленні святыні ў рамках Культурнага праекта «Даследаванне і факсімільнае

выданне помніка беларускага пісьменства – Жухавіцкага Евангелля XVI стагоддзя» з фондаў Бібліятэкі імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук. Набытае факсіміле экспануецца ў выставачнай зале «ExLibris».

Трэці год запар бібліятэка станавілася адной з пляцовак Велікоднага фестывалю, які штогод праводзіць Віцебская епархія Беларускай праваслаўнай царквы. У мінулым годзе ён быў прысвечаны 900-годдзю заснавання Спаса-Еўфрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў Полацку, 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і святым новапакутнікам, спавядальнікам і ўсім пацярпелым за веру Хрыстову ў час ганенняў. У конкурсе прынялі ўдзел 46 чалавек. Па выніках праслухоўвання журы вызначыла пераможцаў I, II і III ступені ў намінацыях «Чытальнік духоўнай паэзіі і прозы» і «Паэт» у кожнай з узроставых груп. Усе канкурсанты адзначаны граматамі за актыўны ўдзел у конкурсе. У якасці журы выступілі прадстаўнікі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, Беларускага тэатра «Лялька», Віцебскай епархіі, Віцебскай абласной бібліятэкі і іншых устаноў культуры і адукацыі.

Свабодны доступ усіх катэгорый грамадзян да прававой інфармацыі і актыўную сацыякультурную дзейнасць, накіраваную на павышэнне прававой граматнасці насельніцтва, забяспечваў аддзел прававой інфармацыі і электронных рэсурсаў. У адпаведнасці з мэтавай комплекснай праграмай прававой асветы дзяцей і моладзі ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна, разлічанай на 2024–2026 гады, аддзелам быў падрыхтаваны і праведзены шэраг інфармацыйна-асветніцкіх і сацыякультурных мерапрыемстваў розных форм і тэматыкі. Нагадаем найбольш значныя з іх: круглые сталы «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь» і «30 гадоў інстытуту прэзідэнцтва Рэспублікі Беларусь – 30 гадоў развіцця», гадзіна карыснага інфармавання «Як абараніць сябе ад кіберзлачынцаў», гадзіна прававых ведаў «Скрозь лабірынты сямейнага права», прававая лекцыя «Пад аховай закона», прававая гутарка «Наркотыкі і наркаманія: небяспечнае кола», медыягадзіна «Інфармацыя і інфармацыйная бяспека». У рамках адзначанай праграмы на працягу года ажыццяўляўся асветніцкі праект «Правазнайка», мэтавай аўдыторыяй якога сталі малодшыя школьнікі ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Віцебска». На працягу года ў яго рамках адбылося дзевяць заняткаў прававой тэматыкі.

З мэтай прыцягнення ў бібліятэку новых карыстальнікаў, папулярызацыі чытання ў асяроддзі дзяцей і падлеткаў, а таксама раскрыцця фонду, на працягу года ў дзіцячым і юнацкім аддзелах вялася актыўная сацыякультурная дзейнасць. Найбуйнейшыя мерапрыемствы комплекснага характару былі прымеркаваны да святочных падзей і знакавых дат календара: Міжнароднага дня роднай мовы, Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі, Дня бібліятэк Беларусі, Тыдня бацькоўскай любові.

Пры ўсёй разнастайнасці напрамкаў работы з дзіцячым чытачом патрыятычнае выхаванне заставалася прыярытэтным. У справаздачным годзе юнацкі аддзел працягнуў работу па праекце «Беларусь – краіна маёй будучыні», накіраваным на знаёмства юнакоў з гісторыяй, прыродай, традыцыямі, знакамітымі постацямі краіны. У яго рамках былі праведзены экалагічны ўрок да Дня Чарнобыльскай трагедыі «Зона адчужэння», бібліяп’едэстал «Беларускае золата» да Міжнароднага Алімпійскага дня, гадзіна інфармавання «Ціха! Ідзе здымка!» да Дня беларускага кіно.

У рамках праекта «Урокі грамадзянскай культуры на розных мовах» супрацоўнікі аддзела выданняў на замежных мовах правялі шэраг мерапрыемстваў патрыятычнай накіраванасці, у тым ліку: літаратурна-адукацыйную гульню «Беларускія народныя святы», прысвечаную славянскім каляндарным святам, гадзіну інфармацыі «Ведай і шануй дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь» да Дня Дзяржаўнага флага, герба і гімна, гадзіну краіназнаўства «Родная Беларусь» да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і творчую майстэрню «Крылаты сімвал краіны – бусел».

Сумеснымі намаганнямі аддзелаў абслугоўвання ў 2024 годзе былі працягнуты сацыякультурныя праекты для юных чытачоў: «Я в этом городе живу, я этот город знаю», «Паклон беларускаму Слову!», «Пра Беларусь па-англійску», «Суразмоўца», «Адкрыты свет», «Гісторыя кнігі сваімі рукамі», «Бібліятэчныя кінаўрокі для школьнікаў», «Школа фінансавай пісьменнасці для дзяцей».

У 2024 годзе працягвалася работа з людзьмі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і сацыяльна неабароненымі слаямі насельніцтва. Цэнтральным падраздзяленнем па ажыццяўленні інклюзіўнай дзейнасці ў бібліятэцы заставаўся аддзел перыядычных выданняў. Яго супрацоўнікамі пры рэалізацыі бібліятэчнага пректа «Разам!» быў праведзены шэраг сацыякультурных мерапрыемстваў, накіраваных на арганізацыю вольнага часу людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, у тым ліку: музычна-спартыўнае свята «Кірмаш “Таленты без межаў”», брэйн-рынг «Знатакі дарожнага руху», выстава-конкурс самадзейнага выяўленчага мастацтва «У свеце фантазій».

Традыцыйна напрыканцы восені адбылося галоўнае навуковае мерапрыемства года – навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Дзясятая па ліку, яна была прысвечана 1050-годдзю г. Віцебска і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і праходзіла ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна 21–22 лістапада. Акрамя бібліятэкі арганізатарамі канферэнцыі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Віцебскі абласны краязнаўчы музей. У рамках канферэнцыі ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адбыўся круглы стол, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ажыццявілі работу секцыі «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край ад старажытнасці да 1917 г.», «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край з 1918 да 1941 г.», «Гістарычнае краязнаўства. Віцебскі край з 1941 г. да сучаснасці. Літаратуразнаўства», «Краязнаўства ў сістэме гуманітарных навук». Падчас канферэнцыі адбылося адкрыццё выставы кніжных рарытэтаў з дамашняй бібліятэкі краязнаўцы Аркадзя Падліпскага «Собрание заветных книг». Па выніках канферэнцыі будзе падрыхтаваны аднайменны зборнік матэрыялаў.

У 2024 годзе Віцебская абласная бібліятэка ў другі раз увайшла ў склад арганізатараў адкрытых абласных адукацыйных Срэценскіх чытанняў «Асновы праваслаўнай культуры. Досвед узаемадзеяння ўстаноў адукацыі і Царквы», якія пры падтрымцы галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі праводзіць Віцебская епархія Беларускай праваслаўнай царквы. Пасяджэнне секцыі «Бібліятэка – цэнтр духоўна-маральнай асветы і выхавання» прайшло ў бібліятэцы 20 лютага. У яе рабоце прынялі ўдзел бібліятэкары ўстаноў сярэдняй і сярэдняй спецыяльнай адукацыі горада Віцебска і вобласці, спецыялісты і кіраўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі, Чашніцкай і Віцебскай раённых цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. Платформа Zoom дазволіла ўдзельнічаць у рабоце секцыі яшчэ 12 прадстаўнікам публічных і школьных бібліятэк рэгіёна.

Двойчы за год адбыліся сходы кіраўнікоў цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм Віцебшчыны ў фармаце Савета дырэктараў. Першы з іх прайшоў у лютым, на ім былі падведзены агульныя вынікі работы за 2023 год і вызначаныя асноўныя задачы на 2024-ы. Чарговае пасяджэнне Савета дырэктараў адбылося напрыканцы года. Цэнтральнымі пытаннямі сустрэчы сталі падрыхтоўка справаздач за 2024 год і фарміраванне штатаў публічных бібліятэк сеткі Міністэрства культуры на наступны. Другая частка семінара прайшла ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага ДУ «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска» ў фармаце круглага стала па тэме «Бібліятэка як рэсурс патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення».

Двойчы збірала абласная бібліятэка кіраўнікоў і спецыялістаў публічных бібліятэк вобласці і на навучальныя мерапрыемствы: семінар-практыкум «Выдавецкая і бібліяграфічная дзейнасць публічных бібліятэк: выклікі часу» адбыўся 23 красавіка для бібліёграфаў цэнтральных бібліятэк, а 22–23 мая прайшоў семінар «Бібліятэчнае абслугоўванне: сучасныя падыходы і пошук новых фарматаў», мэтавай аўдыторыяй якога сталі загадчыкі дзіцячых бібліятэк і загадчыкі аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі раённых і гарадскіх сетак публічных бібліятэк Віцебскай вобласці.

Сустрэча «Літаратурны стыль», арганізаваная Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, прайшла 13 лістапада. Гэта была першая з запланаваных сустрэч з кіраўнікамі і спецыялістамі па камплектаванні фондаў бібліятэк краіны. Удзельнікамі яе сталі і прадстаўнікі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, пісьменнікі.

Прадстаўнікі бібліятэчных сістэм рэгіёна 30 лістапада прынялі ўдзел у Рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства», што прайшла ў абласной бібліятэцы. У ходзе зацікаўленай гутаркі з начальнікам упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Пятром Падгурскім і генеральным дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзімам Гігіным абмяркоўваліся пытанні, якія датычацца дзейнасці бібліятэк для ўмацавання інтэлектуальнага адзінства краіны. У ходзе акцыі раённыя бібліятэкі атрымалі сертыфікаты на падключэнне да Электроннай бібліятэкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і падборкі навінак літаратуры для папаўнення фондаў.

У мінулым годзе было працягнута міжнароднае прафесійнае супрацоўніцтва, у першую чаргу з бліжэйшымі суседзямі – калегамі з прыгранічных Смаленскай і Пскоўскай абласцей. У рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве 29 мая з прафесійным візітам бібліятэку наведалі кіраўнікі і спецыялісты Смаленскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкі імя А.Т. Твардоўскага. Падчас сустрэчы прайшоў круглы стол «Патрыятычнае выхаванне новых пакаленняў грамадзян як стратэгічны прыярытэт бібліятэчнай дзейнасці», арганізаваны сумеснымі намаганнямі. Па выніках круглага стала было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве і рэалізацыі сумесных праектаў патрыятычнай накіраванасці паміж абласнымі бібліятэкамі Віцебска і Смаленска, якія пройдуць на працягу 2024–2025 гадоў.

У справаздачным годзе было працягнута супрацоўніцтва з ДБУК «Пскоўская абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка імя В.Я. Курбатава». Галоўнай падзеяй года стаў міжнародны круглы стол «80-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца», які аб'яднаў 30 жніўня ў Пскоўскай абласной бібліятэцы беларускіх і расійскіх бібліятэкараў, краязнаўцаў, гісторыкаў у рамках правядзення Дзён Віцебскай вобласці ў г. Пскове. Прадстаўнікі Віцебскай і Пскоўскай абласных бібліятэк расказалі аб створаных рэсурсах і дзеючых праектах па захаванні гістарычнай памяці і патрыятычным выхаванні. Вынікам прафесійнай сустрэчы бібліятэкараў Беларусі і Расіі стаў план сумесных патрыятычных мерапрыемстваў, падпісаны на падставе дзеючага Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж абласнымі ўніверсальнымі бібліятэкамі прыгранічных тэрыторый дзяржаў-удзельніц. Астатнія мерапрыемствы з пскоўскім бокам прайшлі ў аддаленым фармаце.

У рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве са студзеня 2024 года ў бібліятэцы пачаў дзейнічаць Цэнтр аддаленага доступу да інфармацыйных рэсурсаў Прэзідэнцкай бібліятэкі імя Б.М. Ельцына. Карыстальнікі Віцебскай абласной бібліятэкі атрымалі магчымасць доступу як да ўнікальнай расійскай культурнай, гістарычнай і літаратурнай спадчыны, так і магчымасць пазнаёміцца з творамі і дакументамі па гісторыі Беларусі і Расіі, тэорыі і практыцы беларускай і расійскай дзяржаўнасці.

Бібліятэка не замыкаецца на міжнародным бібліятэчным супрацоўніцтве, але актыўна развівае і сувязі з іншымі культурна-асветніцкімі ўстановамі замежжа. 14 студзеня ў рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным мемарыяльным гісторыка-літаратурным і прыродна-ландшафтным музеем-запаведнікам

А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае» (Расійская Федэрацыя) і Віцебскай абласной бібліятэкай адбылося адкрыццё выставы «Пушкін і Гогаль», а наступная выстава – «Пушкінскія музеі Расіі» – была адкрыта 9 красавіка і запрасіла ў падарожжа па пушкінскіх мясцінах. У гэты ж дзень ад адзначанага музея бібліятэка прыняла ў дар 57 выданняў (38 найменняў) на суму 1216 беларускіх рублёў. Дадзеная замежная бязвыплатная дапамога была зарэгістравана Дэпартаментам па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Круглы стол «Літаратурныя масты» з удзелам беларускіх і расійскіх пісьменнікаў і паэтаў адбыўся ў бібліятэцы 26 лістапада. Асновай для новых беларуска-расійскіх праектаў стане Пагадненне аб супрацоўніцтве і сумеснай дзейнасці паміж Віцебскай абласной бібліятэкай імя У.І. Леніна і Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, якое падпісалі дырэктар абласной бібліятэкі Таццяна Адамян і кіраўнік Прадстаўніцтва Юрый Макушын. У ходзе сустрэчы супрацоўнік Асацыяцыі саюзаў пісьменнікаў і выдаўцоў Расіі Хрысціна Карлава перадала бібліятэцы ад ТАА «Віфсаіда» (г. Масква) кніжны дар у колькасці 300 выданняў сучасных расійскіх аўтараў і пісьменнікаў-класікаў, на якія напрыканцы года былі падрыхтаваны дакументы для рэгістрацыі ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці.

У справаздачным годзе капітальны рамонт у бібліятэцы не адбываўся, затраты на бягучы рамонт склалі 23483 руб. бюджэтных асігнаванняў. На набыццё асноўных сродкаў (10 ПК, 1 ноўтбук, сеткавы накапляльнік) і мадэрнізацыю ПК па бюджэтным каштарысе было выдаткавана 25037 руб. За сродкі спонсарскай дапамогі ў аддзел літаратуры па мастацтве набыты вінілавы прайгравальнік мадэлі Audio-Technica AT-LPW30BK, ажыццяўляўся рамонт абсталявання.

Па стане на канец 2024 года парк ПК бібліятэкі склаў 115 адзінак, аб’яднаных у лакальную сетку. Функцыяніравалі 23 прынтары, 16 шматфункцыянальных прылад, 6 сканераў, 47 блокаў бесперапыннага сілкавання.

У мінулым годзе па-ранейшаму перад бібліятэкай стаяла задача павелічэння долі пазабюджэтных сродкаў у яе фінансаванні. Аб’ём выкананых платных паслуг склаў 27732,63 руб., тым самым перавысіўшы паказчыкі мінулых гадоў.

У 2024 годзе Віцебская абласная бібліятэка адзначыла 95-годдзе з дня свайго заснавання. Асноўнае ўрачыстае мерапрыемства прайшло 4 снежня. У рамках святочнай падзеі бібліятэка была ўзнагароджана Ганаровай граматай Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, адзначаны дасягненні і заслугі супрацоўнікаў, якія былі ўшанаваны ўзнагародамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, Віцебскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы.